*І. С. Чуносава (Рэспубліка Беларусь, Баранавічы,*
*УА “Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт”)*

# КАГНІТЫЎНА-КАМУНІКАТЫЎНЫ ПАДЫХОД ДА ВЫКЛАДАННЯ ЛІНГВАДЫДАКТЫКІ

Авалоданне методыкай выкладання вучэбных прадметаў з'яўляецца важнай задачай фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці будучых педагогаў. Станаўленне асобы будучага настаўніка і яго педагагічнага майстэрства ў значнай ступені залежаць ад засваення метадычных паняццяў, якія характарызуюць асаблівасці адукацыйнага працэсу, падыходы да адбору зместу вучэбных прадметаў, эфектыўныя формы, метады і тэхналогіі навучання. "Методыка выкладання беларускай мовы" як вучэбная дысцыпліна разглядае агульныя пытанні моўнай адукацыі ў школе, адлюстроўвае спецыфіку дзейнасці настаўніка пры вывучэнні ўсіх раздзелаў школьнага курса беларускай мовы, раскрывае змест працы па развіцці маўлення вучняў.

У сваю чаргу, паняцце "лінгвадыдактыка" ў навуковай літаратуры вытлумачваецца па-рознаму. У вузкім сэнсе слова, лінгвадыдактыка — гэта навука, якая вывучае агульныя заканамернасці навучання замежнай мове, выяўляе эфектыўныя спосабы засваення іншамоўных ведаў, уменняў і навыкаў. Існуе таксама традыцыя выкарыстання тэрміна "лінгвадыдактыка" ў шырокім сэнсе гэтага слова і азначэнне яе як тэорыі навучання мове, якая складваецца пад уплывам асаблівасцей вывучаемай мовы і ўяўляе сабой тэарэтычнае абгрунтаванне працэсу навучання мове, уключае канцэпцыі, змест моўнай адукацыі, арганізацыйныя формы, механізмы даследавання і канструявання працэсу навучання [1, с. 13]. У нашым артыкуле мы прытрымліваемся менавіта апошняга меркавання, разглядаючы лінгвадыдактыку як агульную тэорыю, якая вызначае метадалагічныя асновы навучання мове. Дзейсным гэты погляд з’яўляецца ў сучаснай адукацыйнай практыцы ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь. Так, напрыклад, у вучэбных планах, па якіх навучаюцца студэнты спецыяльнасці 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская), пачынаючы з 2021 года, метадычная падрыхтоўка будучых педагогаў да выкладання беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца на аснове вучэбных дысцыплін "Актуальныя аспекты методык выкладання спецыяльных дысцыплін" (курс, у якім, у тым ліку, прадстаўлены звесткі па лінгвадыдактыцы) і "Методыка выкладання беларускай мовы" (курс, які падрабязна разглядае асаблівасці вывучэння ўсіх раздзелаў беларускай мовы і методыку развіцця маўлення вучняў).

Змест лінгвадыдактычных паняццяў, якія неабходна засвоіць будучым настаўнікам беларускай мовы, быў акрэслены беларускімі вучонымі-

метадыстамі (З. Б. Вврановіч, В. А. Ляшчынская, В. У. Протчанка, М. Г. Яленскі і інш.) і працягвае няспынна ўдакладняцца. Яго складаюць звесткі пра вядучыя канцэпцыі, сродкі, метады і прыёмы навучання беларускай мове; пра адметнасць выкарыстання метадаў і прыёмаў навучання ў залежнасці ад мэт урока, зместу моўнага матэрыялу, узросту і ступені падрыхтаванасці навучэнцаў; пра структурныя кампаненты ўрока мовы і іх функцыі; пра тыпы ўрокаў роднай мовы; пра нетрадыцыйныя формы правядзення ўрокаў беларускай мовы ў сучаснай школе [2].

Адной з умоў эфектыўнай арганізацыі работы па вывучэнні лінгвадыдактыкі ў сучасных умовах з'яўляецца рэалізацыя кагнітыўна-камунікатыўнага падыходу. Неабходна адзначыць, што пануючая роля ва ўплыве на адбор прыёмаў і метадаў фарміравання прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў, асабліва гуманітарных спецыяльнасцей, адводзіцца камунікатыўнаму падыходу, які ўзнік у 70-я гады XX стагоддзя на аснове цэлага шэрагу лінгвістычных напрамкаў: прагмалінгвістыкі, лінгвістыкі тэксту, лінгвасеміётыкі, сацыялінгвістыкі і да т. п. Адметнай асаблівасцю дадзенага падыходу стала навучанне мове як сродку маўленчага ўзаемадзеяння ўдзельнікаў камунікацыі з улікам асаблівасцей мадэлі рэальных зносін. У нашай краіне канцэптуальныя асновы дадзенага падыходу складваліся пад уплывам ідэй, прадстаўленых у працах Г. М. Валочка, Ф.М. Літвінка, Л.А. Мурынай, Г. І. Нікалаенка, В.Ф. Русецкага і інш. З цягам часу выкарыстанне камунікатыўнага падыходу ўдасканальвалася і пашыралася, так склалася некалькі яго мадыфікацый, у тым ліку, і кагнітыўна-камунікатыўны падыход.

У навуковай літаратуры побач з тэрмінам "кагнітыўна-камунікатыўны падыход" таксама ўжываюцца такія эквіваленты, як "свядома-камунікатыўны" і "лінгвакагнітыўны". Гэты падыход становіцца вызначальным у пабудове адукацыйнай траекторыі ў розных сферах прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. Навучанне, заснаванае на кагнітыўна-камунікатыўным падыходзе, абапіраецца на такія кагнітыўныя працэсы, як памяць, успрыманне, імкнецца актывізаваць мысленне, уяўленне, узмацніць разуменне навуковых фактаў, выкарыстоўваць структураванне атрыманых ведаў, знайсці новыя формы інфармацыйна-пазнавальнага абмену, механізмаў апрацоўкі і ўключэння інфармацыі ў сістэму ведаў індывіда.

Галоўнымі задачамі выкарыстання кагнітыўна-камунікатыўнага падыходу пры вывучэнні лінгвадыдактычнай тэорыі з'яўляецца фарміраванне ў будучых педагогаў уяўлення пра канцэптуальныя паняцці, звязаныя з навучаннем мове, развіццё свядомага выкарыстання лінгвадыдактычнай тэрміналогіі, разумення цэласнасці адукацыйнага працэсу навучання мове. Паказчыкамі свядомага аперыравання тэрміналагічным апаратам лінгвадактыкі з'яўляецца дакладная суаднесенасць прыкмет, самастойнасць у інтэрпрэтацыі фактаў,

абагульненасць уяўленняў, а ў наступным асэнсаванасць адбору найбольш эфектыўных форм, сродкаў, прыёмаў, метадаў і тэхналогій навучання беларускай мове.

Лінгвадыдактыка арыентавана на вывучэнне спецыяльных метадычных тэрмінаў, паняццяў, аналіз адукацыйных сітуацый, выпрацоўку на гэтай аснове ўменняў, звязаных з вырашэннем педагагічных задач і канструяваннем урокаў беларускай мовы. Змест лінгвадыдактычных тэм дастаткова разнастайны, іх таксама складаюць звесткі з гісторыі станаўлення методыкі выкладання беларускай мовы. Гістарычны агляд ідэй вядомых асветнікаў і метадыстаў (Ф. Скарыны, Л. Зізанія, М. Сматрыцкага, Б. Пачобкі, Я. Лёсіка, К. Міцкевіча і інш.) у свеце кагнітыўна-камунікатыўнага падыходу неабходна ажыццяўляць праз прызму ацэнкі іх уплыву на сучасную практыку выкладання беларускай мовы.

Гаворачы пра развіццё прафесійнай свядомасці будучых педагогаў, слушным уяўляецца звярнуцца да прадстаўленай у даследаванні А. В. Гардзіенка ідэі развіцця ў студэнтаў аналітыка-рэфлексіўнай пазіцыі, якая праяўляецца ў асэнсаванасці лінгваметадычнага погляду на ўласную педагагічную дзейнасць і ўзровень пазнавальнага вопыту навучэнцаў [3, с. 31]. Працуючы над аналізам адукацыйных сітуацый на занятках па методыцы выкладання беларускай мовы, неабходна фарміраваць у студэнтаў механізм разважання над тым, як эфектыўна рэалізаваць агульнадыдактычныя, агульнаметадычныя і прыватнаметадычныя прынцыпы навучання, якія метады і прыёмы з’яўляюцца найбольш эфектыўнымі ў залежнасці ад пастаўленых задач, узроўню ведаў навучэнцаў, тыпу ўрока, якія сродкі навучання мэтазгодна выкарыстоўваць. Пры рэалізацыі кагнітыўна-камунікатыўнага падыходу станаўленне аналітыка-рэфлексіўнай пазіцыі абапіраецца на такія інтэлектуальныя прыёмы, як асэнсаванне стратэгічнай мэты навучання беларускай мове, пастаноўка тактычных мэт урока, фарміраванне гіпотэзы, прагназаванне варыянтаў разгортвання вучэбнага матэрыялу на этапе яго тлумачэння (замацавання, абагульнення, сістэматызацыі), аргументаванне, доказ, мадэляванне, кантроль, карэкцыя, самарэфлексія.

Адметнай асаблівасцю адукацыйнага працэсу, пабудаванага на аснове кагнітыўна-камунікатыўнага падыходу, становіцца сумяшчэнне сэнсавага (кагнітыўнага) ўзроўню свядомасці і камунікатыўнага ўзроўню, які пры навучанні лінгвадыдактыцы вызначае формы арганізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў. Абмеркаванне праблемных сітуацый на практычных занятках мэтазгодна праводзіць у форме разважанняў, дыялогаў, дыскусій, калоквіумаў. Сугучным ідэям кагнітыўна-камунікатыўнага падыходу бачыцца ўкараненне ў якасці арганізацыйнай формы калектыўнага навучання эўрыстычнага палілогу, які валодае значнай лінгвадыдактычнай прадуктыўнасцю. Яго выкарыстанне ў навучанні забяспечвае інавацыйную

логіку ў працэсе асэнсавання, калі выказванні ўдзельнікаў палілогу пачынаюць выступаць у якасці своеасаблівай крыніцы ведаў. Гаворачы становіцца суб'ектам, які не толькі спазнае і арганізуе ўласнае пазнанне, але і ў значнай ступені ўплывае на гэтыя працэсы ў іншых удзельнікаў зносін [4, с. 13].

Такім чынам, выкарыстанне кагнітыўна-камунікатыўнага падыходу пры выкладанні лінгвадыдактыкі спрыяе пабудове трывалай упарадкаванай сістэмы ведаў пра ўніверсальныя законы арганізацыі адукацыйнага працэсу па беларускай мове, стварае педагагічныя ўмовы для разумення, аналізу, сістэматызацыі метадычных паняццяў, выяўлення ўзаемасувязей паміж імі, здольнасці да іх практычнага прымянення ў будучай педагагічнай дзейнасці. Развіццю свядомай аналітыка-рэфлексіўнай пазіцыі і ментальнай актыўнасці будучых настаўнікаў беларускай мовы спрыяюць розныя формы дыялогавага ўзаемадзеяння эўрыстычнай скіраванасці.

### *Літаратура*

1. Лингводидактика и методика обучения иностранным языкам : учеб.-метод. пособие / авт.-сост. О. В. Михалева ; Владим. гос. ун-т им. А. Г. и Н. Г. Столетовых. – Владимир : Изд-во ВлГУ, 2022. – 136 с.

2. Методыка выкладання беларускай мовы: тыпавая праграма для спецыяльнасцей 1-02 03 01 Белорусский язык и литература; 1-02 03 03 Белорусский язык и литература. Иностранный язык (с указанием языка) № ТД-A.550/тип. от 04.02.2015 / М-во образования Респ. Беларусь. — Минск, 2015. — 20 с.

3. Гордиенко, О. В. Креативно ориентированная методика как фактор развития профессионального мышления будущего учителя русского языка / О. В. Гордиенко ; под ред. А. Д. Дейкиной. – Москва : МПГУ, 2017. – 164 с.

4. Король, А. Д. Понятийный круг многосторонней организации обсуждения: эвристический аспект // Весн. адукацыі. – 2020. – № 2. – С. 11–16.